

# «КАЛІ ЁСЦЬ МОМАНТ ЗАРАБІЦЬ ГРОШЫ, ТРЭБА ЗАРАБЛЯЦЬ, ЗАЙМАЦЬ РЫНАК»

**Крытыка, парады, кампліменты – акцэнты чарговага дня камандзіроўкі Прэзідэнта на Магілёўшчыну**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ліпеня 2025 г. СЕРАДА № 129 (30517)

ТУРЫЗМ

# КОННЫЯ ПАХОДЫ І СПЛАВЫ ПА РЭКАХ

**Што наведаць у ліпені, які аб'яўлены месяцам актыўнага адпачынку?**

Ліпень у нашай краіне прысвечаны актыўнаму турызму. Само надвор'е спрыяе пешым і велапрагулкам, конным паходам, водным падарожжам і экатурызму. Варыянты актыўнасцяў прапануюць шэраг арганізацый: ад пракату абсталявання да поўнага суправаджэння, а маршруты (усяго ў нашай краіне іх распрацавана каля 300) вам падкажуць і пакажуць у кожным заказніку ці запаведніку. Цікавасць да актыўных відаў адпачынку ў апошнія гады значна ўзрасла, у тым ліку запатрабавана ў іншаземцаў. Госці з-за мяжы, якія прыязджаюць у Беларусь, часта плануюць падарожжа, уключаючы велапрагулкі, сплавы на байдарках, прагулкі па экасцежках. У беларусаў жа гэта адзін з самых папулярных сёння відаў падарожжаў, у прыватнасці, многія адкрываюць для сябе сплавы па рэках, дзе прыцягвае не толькі навізна маршруту, але і лёгкі экстрым. СТАР. 11







Фота БелТА.



«Вішнёвы сад» гучыць па-новаму 15

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25129>

ДОБРАЯ НАВІНА

# РАНЕЦ З ДАПАМОГАЙ

**Хто і як можа атрымаць выплаты для падрыхтоўкі да навучальнага года?**

З ліпеня пачалі прымаць заявы на аднаразовую выплату да школы. Яе атрымаюць больш за 100 тысяч шматдзетных сем'яў ва ўсіх рэгіёнах краіны.



СТАР. 6

# «КАЛІ ЁСЦЬ МОМАНТ ЗАРАБІЦЬ ГРОШЫ,

## Крытыка, парады, кампліменты — акцэнты

У аўторак Аляксандр Лукашэнка наведаў сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Магілёўскага раёна. На парадку дня прэзідэнцкай камандзіроўкі — некалькі тэм, актуальных для АПК.

### ЧАМУ НЕ ІНТЭНСІФІКАВАЦЬ ПРАЦЭС?

Першая тэма — вырошчванне племянных коз — кірунак вельмі перспектыўны. У 2021 годзе ў Магілёўскім раёне пачалася работа па стварэнні племяннога завода, куды былі завезены 350 козачак і 20 казлоў зааненскай і альпійскай парод. Цяпер на Магілёўскім дзяржплемпрадпрыемстве ўтрымліваецца 687 жывёл, у тым ліку 394 казы матачнага пагалоўя, 17 казлоў-вытворцаў і 276 галоў маладняку. Тут працуюць над стварэннем племянных статкаў з высокім генетычным патэнцыялам. Гэта забяспечыць імпартазамяшчэнне племянной прадукцыі коз і дазволіць павялічыць экспарт новага віду племпрадукцыі. Козагадоўляй займаюцца яшчэ два прадпрыемствы — фермерская гаспадарка ў Дзяржынскім раёне і навукова-практычны цэнтр па жывёлагадоўлі НАН Беларусі. Усяго агульная колькасць коз па краіне ва ўсіх катэгорыях гаспадарак складае каля 48 тысяч галоў, з іх 93 % утрымліваюцца ў насельніцтва, яшчэ 2% — у сялянска-фермерскіх гаспадарках, а астатнія 5 % — у сельгасарганізацыях.

Прэзідэнта цікавілі не справаздачы кіраўнікоў, а адказы на канкрэтныя пытанні: колькі галоў прадалі ў мінулым годзе? якая рэнтабельнасць у прадпрыемства? якія перспектывы? Прэзідэнту далажылі, што попыт на племянных козачак ёсць не толькі ў Беларусі, ужо былі продажы ва Узбекістан, ёсць заяўкі ў Расію. Летась у Магілёўскім дзяржплемпрадпрыемстве прадалі 45 асобін, сёлета — ужо 174.

«Калі такі попыт, мы можам павялічваць вытворчасць козачак?» — спытаў Прэзідэнт. Яму адказалі, што гэта цалкам магчыма. «А чаму тады не робім? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — А чаму не займацца гэтым, чаму не інтэнсіфікаваць працэс? Тут добрая справа, перспектыўная, попыт ёсць».

**Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што калі на ўзроўні дзяржавы сістэмна не займацца гэтым пытаннем, то выніку не будзе. Насельніцтва ж нельга прымусіць разводзіць коз — людзі гэтым займаюцца па ўласным жаданні і з улікам сваіх магчымасцяў. А калі ёсць попыт у іншых краінах, то трэба сістэмна арганізоўваць работу, павялічваць вытворчасць і кантраляваць працэсы з боку дзяржавы.**

Прэзідэнт асабіста азнаёміўся з утрыманнем жывёл на прадпрыемстве. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, што трэба, каб на працягу года падвоіць вытворчасць? Цяпер асноўнае пытанне, якое трэба для гэтага вырашыць, — закупка дадатковага пагалоўя коз для развядзення. У цэлым, па словах спецыялістаў, прыкладна за год можна падвоіць вытворчасць. Прэзідэнт паставіў канкрэтную задачу — да сярэдзіны 2026 года падвоіць паказчыкі і далей іх падвойваць пастаянна.

**«Павінна быць падваенне, пакуль ёсць попыт. Вось яны, жывыя грошы», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы настройвае на тое, што мала засвоіць тэхналогію — трэба нарошчваць аб'ёмы і развівацца.**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер таго, што ёсць у козагадоўлі ў маштабах краіны, малавата. Тым больш што вялікіх сродкаў і укладанняў для будаўніцтва памяшканняў для ўтрымання коз не трэба.

**Прэзідэнт зрабіў заўвагу кіраўніцтву Магілёўскай вобласці, памочніку-інспектару па вобласці наконт таго, што на ўзлесках гніе лес. А між тым гэту сыравіну можна выкарыстоўваць у гаспадарчых мэтах. Прэзідэнт паставіў задачу зрабіць так, каб да 1 верасня па краіне не было «ні аднаго бервяна, якое валяецца на ўзлеску».**

Кажучы пра козагадоўлю, Аляксандр Лукашэнка некалькі разоў паўтарыў, што трэба ісці па максімуме.

**«Калі ёсць момант зарабіць грошы, трэба зарабляць, займаць рынак», — патрабуе беларускі лідар. Гэта, зразумела, датычыцца і іншых кірункаў у сельскай гаспадарцы. «Мы па-напляваецельску ставімся да сельскай гаспадаркі — цешымся, што ў нас усяго хапае і амаль на сем мільярдаў долараў прадаём. А руху далей няма. Вось як тут. Справа так далей не пойдзе, што мы сяк-так працуем», — сказаў ён.**

Для вырашэння гэтых задач патрэбна моцнае кіраўніцтва. На Магілёўскім дзяржплемпрадпрыемстве пакуль няма гендырэктара. Папярэдні кіраўнік Мікалай Арлёнак перайшоў на пасаду старшыні Горацкага райвыканкама. Прэзідэнт даручыў аператыўна вызначыцца і падабраць на прадпрыемства кіраўніка.

Прэзідэнту падарылі дзвюх коз — зааненскай і альпійскай парод. У казы зааненскай пароды сутачны надой 3,7 кг, у альпійскай — 4,6 кг. Гэтыя пароды найбольш распаўсюджаныя ў свеце, яны адрозніваюцца высокай прадукцыйнасцю. Пароды непатрабавальныя да ўмоў утрымання і здольныя пераносіць нават суровыя ўмовы надвор'я. А іх малако пазбаўлена спецыфічнага паху і па смаку практычна не адрозніваецца ад каровінага.

У гэтым усе пераканаліся на дэгустацыі прадукцыі з казінага малака і ўласна самога малака. На дэгустацыі прадставілі і вырабы з казінага мяса, якое валодае унікальнымі пажыўнымі якасцямі. Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў казінае малако, спадабаўся кіраўніку дзяржавы і сыр, выраблены з сумесі казінага і каровінага малака. Спецыялісты з «Бабушкінай крынкі» і Магілёўскага мясакабіната, якія вырабляюць прадукцыю з сыравіны ад коз, запэўнілі, што рэнтабельнасць добрая, прадукцыя запатрабаваная на беларускім і расійскім рынках.

**«Выдатнае малако. І дзеткам гэта вельмі важна, — сказаў Прэзідэнт. — Харчаванне — перш за ўсё псіхалогія. Калі ведаеш, што гэта карысна — добра. Калі не ведаеш, што гэта карысна, тады доўга будзеш прывыкаць, агітаваць трэба. Трэба ўлезці чалавеку ў галаву з гэтым сырам. І даказаць яму, што гэта вельмі карысна».**

### «ТАКІЯ ГАСПАДАРКІ ТРЭБА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ»

Яшчэ адзін прыпынак прэзідэнцкай камандзіроўкі — агракамбінат «Зара». Першае, што цікавіла кіраўніка дзяржавы, — фінансава-гаспадарчая дзейнасць прадпрыемства. Тут перапрацоўваюць свініну, якую атрымліваюць на ўласным свінакомплексе, ёсць свая птушкафабрыка, уласны мясакамбінат, два малочнатаварныя комплексы — уся прадукцыя рэалізоўваецца праз уласную гандлёвую сетку ў Магілёве і Магілёўскай вобласці. Усё, што выраблядецца, перапрацоўваецца на 100 %. Генеральны дырэктар агракамбіната Кацярына Зароўская далажыла, што сярэдняя рэнтабельнасць па гаспадарцы — 6,6 %, а ў перапрацоўцы — каля 12 %. Прыбытак накіроўваецца на развіццё вытворчасці, абнаўленне тэхнікі.





# ТРЭБА ЗАРАБЛЯЦЬ, ЗАЙМАЦЬ РЫНАК»

## чарговага дня камандзіроўкі Прэзідэнта на Магілёўшчыну



«Вы павінны ведаць, што вы людзі дзяржаўныя...» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «І выконваць неабходныя вытворчыя паказчыкі і забяспечваць харчовую бяспеку», — працягнула Кацярына Зароўская.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што працаўнікі сельгаспрадпрыемстваў хочуць бачыць дасведчанага кіраўніка. І спытаў, як Кацярына Зароўская спраўляецца з гэтай задачай. Яна адказала, што ўсе ключавыя вытворчасці засяроджаны разам у адным аграгарадку Рэчкі. А землі, якія былі далучаны дадаткова, аддавалі найперш пад раслінаводства. Генеральны дырэктар расказала, што яе галоўная мэта — пастаянна пашыраць і развіваць гаспадарку.

**«Гаспадаркі, якія так працуюць, паспяваюць разлічыцца, не маюць даўгоў перад дзяржавай і банкам, трэба падтрымліваць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што ў нас ёсць усё для развіцця сельскай гаспадаркі, не хапае толькі арганізацыі.**

Аляксандр Лукашэнка таксама падзяліўся ўласным досведам і прызнаўся, што для яго найлепшая праца — кіраўніком сельскагаспадарчага прадпрыемства. Кацярына Зароўская пагадзілася з Прэзідэнтам: «Мне нельга ў кабінет. Я люблю поле, камбайны. У сельскай гаспадарцы трэба жыць, а не адбываць. Калі ты адбываеш — выніку не атрымаеш. У сельскую гаспадарку трэба ўкладваць душу. Гэта жыццё, і інакш ніяк».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на нарыхтоўку кармоў. Напрыклад, у гаспадарцы ўжо скасілі люцэрну. Кіраўнік дзяржавы спытаў, ці не рана. Але Кацярына Зароўская запэўніла, што люцэрна сёлета добрая і скасілі яе своечасова. Тэрміны ўборкі і рост культур, па словах кіраўніка прадпрыемства, тут знаходзяцца пад пільным кантролем, усё ўбіраецца тады, калі сапраўды трэба.

**Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер вельмі прыдатны час для росту траў на кармы. Таму трэба звярнуць на гэта пільную ўвагу і не забываць пра тэхналогіі захоўвання кармоў. З гэтым ёсць нюансы, Камітэт дзяржкантролю дакладыў Прэзідэнту аб парушэннях. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што падобнага быць не павінна.**

«Зара» паспяхова працуе і па вырошчванні сельскагаспадарчых культур. Размова адбылася непасрэдна на полі з азімым ячменем. Ураджайнасць гэтай культуры ў «Зары» перавышае 60 ц/га. Як заўважыў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, для Магілёўшчыны азімы ячмень — выратаванне. Гэтую культуру ўбіраюць раней за іншыя збожжавыя. Дзякуючы такой асаблівасці, можна аператыўна атрымаць кармы для жывёлагадоўлі і больш раўнамерна задзейнічаць тэхніку перад масавай уборкай. Азімы ячмень — культура капрызная, але, як заўсёды, усё вырашаюць тэхналогіі — пры іх выкананні можна смела разлічваць на добры вынік. Досвед «Зары» гэта пацвярджае.

Асобна Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся актуальнай для многіх гаспадарак праблемай, асабліва вострай у Магілёўскай вобласці, — падзяжом жывёлы. Але кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што ў «Зары» вялікай праблемы з гэтым няма.

### Даслоўна

Журналістам **генеральны дырэктар «Зары» Кацярына ЗАРОЎСКАЯ** расказала, што цяжкасці ў яе працы звязаныя толькі з некаторымі тэхналагічнымі нюансамі. «Усе бачаць, чуюць і разумеюць, што жаночую працу трэба падтрымліваць. Мужчыны падстаўляюць плячо, і таму я адчуваю сябе ўпэўнена, на дзвюх нагах, хоць часам прыходзіцца знаходзіць бізун і пернік», — прызналася яна. Калі казаць больш прадметна, то цяпер, па словах гендырэктара, найбольшую складанасць для аграрыяў уяўляюць умовы надвор'я, бо на іх нельга ўплываць. Сакрэтам поспеху Кацярына Зароўская назвала любоў: «Калі ты робіш гэтую працу з душой, то атрымліваецца вынік».



**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**
*Магілёўскі раён.*





НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ

# ПАМЯТАЦЬ І ШАНАВАЦЬ НАШУ АГУЛЬНУЮ ГІСТОРЫЮ

## Урачыста адкрыўся Х Міжнародны форум «Дзеці Садружнасці»



**У аўторак у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося ўрачыстае адкрыццё Х Міжнароднага форуму «Дзеці Садружнасці». Некалькі разоў яго прымаў Кыргызстан, праходзіў ён ва Узбекістане, у Расіі. А ў дзясяты юбілейны раз ён упершыню праходзіць у нашай краіне. Наперадзе ва ўдзельнікаў — насычаная праграма. Асноўным месцам правядзення стане Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». Там, на беразе Нарачы, каля сотні прадстаўнікоў з васьмі краін даведаюцца шмат новага і цікавага аб Беларусі.**

Знакавае месца адкрыцця форуму — Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — добрая нагода гаварыць аб агульнай слаўнай гісторыі. «Мы павінны з вамі зрабіць усё, каб мір і спакой былі ў нашых краінах, каб нашы краіны сябравалі. І таму праводзіцца столькі мерапрыемстваў, прысвечаных нашай моладзі», — звярнулася да ўдзельнікаў форуму **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

«Мы дакладна разумеем: моладзь павінна сябраваць, камунікаваць, бо яна — будучыня нашых краін. Наколькі вы сёння будзеце разам памятаць і шанаваць сваю гісторыю, нашу агульную гісторыю, настолькі будуць сяброўскія і добрыя адносіны паміж нашымі краінамі, — заўважыла Наталля Качанава. — Мы, парламентарыі, працуем на розных міжнародных пляцоўках — пад эгідай МПА СНД, асамблеі АДКБ і іншых, але ўсюды гаворым аб адным. У пачатку гэтага года ў Санкт-Пецярбургу прайшло мерапрыемства, якое было прысвечана Вялікай Перамозе. І там, выступаючы, спікеры ўсіх краін, прадстаўнікі моладзі якія прысутнічаюць тут, разам казалі: мы павінны памятаць і шанаваць нашу агульную гісторыю. Для Беларусі, як і для любой іншай дзяржавы, гэта гісторыя святая».

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла плённае ўзаемадзеянне парламентарыяў краін: «Сімвалічна, што гэты форум праходзіць пад той знакавай падзеяй, якую адзначалі ўсе нашы краіны — гэта 80-годдзе Вялікай Перамогі. І мы рады таму, што маладыя людзі, якія прыязджаюць з розных куткоў свету (а сёння тут прадстаўнікі 8 краін былога Савецкага Саюза), — нашчадкі пераможцаў, якія адваявалі свабоду і незалежнасць нашай тады агульнай Радзімы, — сёння сабраліся зноў разам для таго, каб успомніць старонкі гісторыі, каб шанаваць памяць і перадаваць яе з пакалення ў пакаленне. Вядома, для нас гэта вельмі важна».

Як адзначыў **генеральны сакратар Савета МПА СНД Дзмітрый КАБІЦКІ,** тэма форуму пад назвай «Памяць і адзінства пакаленняў» стане напамінам пра тое, як важна захоўваць гісторыю і быць разам: «Сёння наша самая галоўная задача — перадаць малодшым пакаленням памяць аб гэтай вайне, зрабіць усё магчымае, каб і яны захоўвалі яе яшчэ доўгія гады».

Галоўная мэта форуму — сяброўства народаў. «І дзеці на такіх форумах вучацца не проста камунікаваць, але і расказваць пра культуру, гісторыю, архітэктуру, традыцыі сваіх краін. І вельмі важна, што яны дзеляцца гэтай інфармацыяй і дапамагаюць адно аднаму разумець, што адбываецца ў той ці іншай дзяржаве, як яна развіваецца. Паколькі кожная з іх па-свойму ўнікальная», — адзначыў Дзмітрый Кабіцкі.

### «АСАБЛІВА ЦІКАВА СТАЛА, КАЛІ ДАВЕДАЛАСЯ, ШТО ПАЕДУ Ў БЕЛАРУСЬ»

Пасля ўрачыстага адкрыцця форуму яго ўдзельнікі падзяліліся сваімі ўражаннямі. Для Аляксандра Суворава, прадстаўніка Расіі, вельмі важная і цікавая тэма Вялікай Айчыннай вайны: «Я лічу, што трэба шанаваць памяць усіх людзей, якія аддалі свае жыцці за нашу свабоду». Ён таксама прызнаўся, што на ўдзел у форуме яго падштурхнулі асабістыя перакананні і водгукі ўдзельнікаў мінулых гадоў: «Яны расказвалі, што форум пакідае незабыўныя ўспаміны. І ў цэлым, як можна адмовіцца ад такой цудоўнай ініцыятывы?»

Аляксандр расказаў таксама, што задумалі дзеці на дзень сваёй краіны. «Будзе вялікая колькасць нумароў з песнямі, танцамі і майстар-класамі. Усё на вышэйшым узроўні, бо мы доўга і старанна рыхтаваліся». Хлопец паспеў пазнаёміцца з прадстаўнікамі некаторых дэлегацый. «Вельмі прыемныя і добрыя людзі, паміж намі не адчуваецца адрозненняў, якія могуць стаць перашкодай. Хутчэй адрозненні ў нацыянальнасці, гісторыі і мове робяць наша ўзаемадзеянне больш цікавым і дазваляюць вывучаць гісторыю нашых краін».

Сваімі ўражаннямі падзялілася ўдзельніца форуму з Казахстана Сафія Бекетава. Яна паведаміла: паўдзельнічаць у форуме яе запрасілі дзякуючы актыўнасці дзяўчыны як у школе, так і ў роднай вёсцы. «Ну і проста я вельмі прыязны чалавек, — дадала яна. — Асабліва цікава стала, калі даведалася, што паеду ў Беларусь. Мяне гэта вельмі натхніла, і я адразу ж пагадзілася».

Школьніца прызналася, што наведвае нашу краіну ўпершыню і ўражанняў у яе асабліва шмат. «Мне спадабаўся баланс прыроды і інфраструктуры, дзейнасці чалавека. А яшчэ я заўважыла, што ў Беларусі ўсюды прысутнічае патрыятызм, і мне гэта вельмі падабаецца». Паводле яе слоў, форум — ідэальнае месца для таго, каб даведацца пра культуру іншых краін і праявіць талент. Для гэтага ў праграме прадугледжаны дні, прысвечаныя пэўным дзяржавам. Удзельніца дадала, што адна з яе мэт на форуме — годна прадставіць сваю краіну.

Дарэчы, 9 ліпеня на форуме — дзень Рэспублікі Беларусь. Нашы ўдзельнікі паабяцалі: будзе надзвычай цікава.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# КАШТОЎНАСЦІ ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ

## «Арганізацыя па-свойму цікавая, унікальная, адзіная ў сваім родзе»



Фота з ТГ-канала Палаты прадстаўнікоў.

**Менавіта так выказаўся Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА аб нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі «Белінкасгруп». Яна па сваім прызначэнні сапраўды ўнікальная, бо адзіная ў краіне аказвае паслугі інкасацыі і банкам, і суб'ектам гаспадарання — у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі № 225 на НКФА была ўскладзена рэалізацыя выключнага права дзяржавы на ажыццяўленне інкасацыі наяўных грашовых сродкаў, перавозкі наяўных грашовых сродкаў і іншых каштоўнасцяў.**

«Работа НКФА носіць адносна закрыты характар: бачым толькі фургоны, людзей ва ўніформе, якія перавозяць на аўтамабілях значныя і нязначныя сумы грашовых сродкаў, забяспечваючы тым самым іх захаванасць і бяспеку, — падзяліўся Ігар Сергяенка ў размове з журналістамі пасля наведвання арганізацыі. — На працягу шэрагу гадоў не было ні адной надзвычайнай сітуацыі, звязанай з рызыкай для жыцця як навакольных, так і непасрэдна работнікаў арганізацыі. Я ўбачыў, як наладжаны кантроль непасрэдна з гэтага цэнтра за перамяшчэннем практычна кожнай машыны, за зборам сродкаў, дастаўкай, іх захоўваннем. Паказалі таксама экіпіроўку, зброю, што сёння выкарыстоўваецца супрацоўнікамі. Тут спалучаецца і вопыт тых людзей, якія прайшлі службу ва Узброеных Сілах нашай краіны, падраздзяленнях МУС. Працаваць прыходзяць маладыя хлопцы, якія пасля службы ў арміі пад настаўніцтвам таксама становяцца прафесіяналамі. Тут працуюць і жанчыны, прытым не толькі касірамі, але, скажам так, і на баявой рабоце. Арганізацыя па-свойму цікавая, унікальная, адзіная ў сваім родзе».

Старшыні Палаты прадстаўнікоў прадэманстравалі аснашчэнне брыгады інкасатараў, расказалі аб тым, які спецаўтатранспарт і зброя прымяняюцца ў дзейнасці. Прадстаўнікі інкасатарскай службы асобна спыніліся на бронекамізэльках, распрацаваных беларускім вытворцам спецыяльна для гэтай кампаніі. Яны маюць меншую вагу, што палягчае выкананне задач супрацоўнікамі службы. Пры гэтым ступень абароны застаецца на тым жа высокім узроўні. Ігар Сергяенка азнаёміўся з работай цэнтра маніторынгу, куды ў рэжыме рэальнага часу паступае інфармацыя пра перамяшчэнне і тэхнічны стан аўтамабіляў, якія знаходзяцца на маршрутах.

Адбылася таксама сустрэча Старшыні Палаты прадстаўнікоў з працоўным калектывам, падчас якой Ігар Сергяенка падрабязна расказаў аб дзейнасці дэпутацкага корпуса. Закранулі і пытанні карпатлівай работы над законапраектамі, што выносяцца ў Авальную залу пасля дыскусій у спецыяльна створаных рабочых групах. Акрамя таго, спікер падзяліўся нюансамі дзейнасці парламентарыяў у акругах, адзначыўшы, што яна накіравана на тое, каб адчуць нерв грамадства. Для гэтага, паводле слоў Ігара Сергяенкі, прадугледжаны цэлы комплекс мерапрыемстваў — дэпутаты бяруць удзел у грамадска-палітычных мерапрыемствах, праводзяць прыёмы грамадзян, сустракаюцца з людзьмі ў розных калектывах. Спікер таксама расказаў і аб міжнароднай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў. Ён падкрэсліў, што дэпутаты надаюць вялікае значэнне народнай дыпламатыі: «Прэзідэнт нас нацэльвае на гэта».

Супрацоўнікі «Белінкасгруп» адрасавалі Старшыні Палаты прадстаўнікоў шэраг пытанняў. У тым ліку цікавіліся, хто ў краіне часцей за ўсё выступае з заканадаўчымі ініцыятывамі. Кіраўнік дэпутацкага корпуса звярнуў увагу, што часцей за ўсё законапраекты паступаюць ад Урада, падкрэсліўшы, што заканадаўчай ініцыятывы ад дэпутацкага корпуса павінна быць больш.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# МАКСІМАЛЬНАЯ НАЦЭЛЕНАСЦЬ НА ВЫНІК

## Беларусь прапануе Свярдлоўскай вобласці стварэнне сумесных прадпрыемстваў і дапамогу ў будаўніцтве метро

**Аб гэтым заявіў намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Віктар КАРАНКЕВІЧ па выніках перагавораў у Екацярынбургу з часова выконваючым абавязкі губернатара Свярдлоўскай вобласці Дзянісам Паслерам, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

«У нас са Свярдлоўскай вобласцю даволі вялікі тавараабарот. Неабходна выйсці на $1 мільярд. Такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы. Мы на гэта нацэлены. Тут даволі вялікі спектр кірункаў дзейнасці — і пастаўкі сельскагаспадарчай, пасажырскай, дарожна-будаўнічай, камунальнай тэхнікі, і ліфтаў, і кааперацыйныя сувязі. Сумеснае прадпрыемства па вытворчасці гідраўлічнага абсталявання працуе ў Пінску. Мы намецілі планы па далейшым развіцці супрацоўніцтва. Гэта праект па распрацоўцы доследна-канструктарскай дакументацыі з далейшай вытворчасцю шматфункцыянальнага 19-меснага самалёта «Асвей», а таксама пытанне стварэння сумесных прадпрыемстваў у Екацярынбургу. У прыватнасці, магчымасць зборкі трамваяў з мадэрнізацыяй цялежкі і пастаўкамі машынакамплектаў вытворчасці «Белкамунмаша». Ну і, вядома ж, мы прапануем нашы кампетэнцыі ў праектаванні і будаўніцтве шматкватэрных і індывідуальных дамоў і метро», — падкрэсліў Віктар Каранкевіч.

Дзяніс Паслер у сваю чаргу адзначыў, што адносіны Свярдлоўскай вобласці з Беларуссю выбудаваны даўно і заўсёды былі вельмі плённымі і рознабаковымі, актыўна развіваліся — як у эканамічнай сферы, так і ў галіне культуры, адукацыі, спорту. Паводле яго слоў, значная частка аграрнай тэхнікі на палях рэгіёна — беларускай вытворчасці. Свярдлоўская вобласць нацэлена на далейшае інтэнсіўнае супрацоўніцтва.

Таксама адбыліся сустрэчы беларускага віцэ-прэм'ера з губернатарам Калужскай вобласці Уладзіславам Шапшой і кіраўніком Рэспублікі Башкартастан Радзіем Хабіравым. «У нас вельмі шмат кірункаў супрацоўніцтва. Гэта пастаўкі беларускай тэхнікі, абсталявання, развіццё сумесных прадпрыемстваў. У нас максімальная нацэленасць на вынік, на заключэнне новых кантрактаў і доўгатэрміновае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва», — адзначыў Віктар Каранкевіч.

Як вядома, Беларусь прадстаўляе нацыянальную экспазіцыю на выстаўцы «ІНАПРАМ» у Екацярынбургу. Галоўная яе тэма сёлета — «Тэхналагічнае лідарства: індустрыяльны прарыў». Віцэ-прэм'ер адзначыў, што гэта адна з важных прадстаўнічых міжнародных выставак, і Беларусь з 2012 года з'яўляецца яе пастаянным удзельнікам. «Вядома, тут прадстаўлены нашы найбуйнейшыя прадпрыемствы, брэнды, прадукцыя, якая карыстаецца попытам і добра сябе зарэкамендавала ў спажыўцоў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Гэта добрая пляцоўка, дзе можна паказаць новыя тэхналогіі, новыя тэхнічныя рашэнні. Сваю тэхніку прадставілі МАЗ, «БКМ Холдынг», «Інтэграл», «Гарызонт» і іншыя прадпрыемствы. Тут можна паглядзець і навуковыя распрацоўкі нашых арганізацый, без якіх сучасная прамысловасць развівацца не можа. Гэтыя тэхналогіі даюць магчымасць забяспечыць далейшае інавацыйнае паступальнае развіццё нашай прамысловасці. Беларуская прамысловая прадукцыя запатрабавана прадпрыемствамі Расіі і іншых краін ЕАЭС. Гэта дае магчымасць для выбудоўвання кааперацыйных сувязяў, стварэння сумесных прадпрыемстваў. Выстаўка — выдатная магчымасць абмену вопытам, пэўнымі кампетэнцыямі, заключэння эфектыўных кантрактаў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.



Як адзначыў **міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ**, наша краіна гатова вырабляць запатрабаваную прадукцыю пад патрэбы любога рынку: «Мы гатовы вырабляць электратранспарт, транспарт на газе і на іншых відах паліва — тую тэхніку, якую патрабуе рынак. Расія — вялікі рынак, там запатрабаваны розныя віды тэхнікі. І мы гатовы прапаноўваць і пастаўляць».

Адметна, што сёлета «ІНАПРАМ» у Екацярынбургу з'яўляецца сувязным мостам да будучай падзеі ў Мінску. Выстаўка «ІНАПРАМ. Беларусь» пройдзе ў беларускай сталіцы з 29 верасня да 1 кастрычніка. Там будуць прадстаўлены асноўныя навінкі беларускай прамысловасці і спадарожных галін.

# ПА ЎНІФІКАВАНЫХ ПРАВІЛАХ

## Аптымізавана працэдура рэгістрацыі і экспертызы медвырабаў у ЕАЭС




**На пасяджэнні Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі былі зацверджаны змяненні ў правілы рэгістрацыі і экспертызы бяспекі, якасці і эфектыўнасці медыцынскіх вырабаў. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе ЕЭК.**

Пасяджэнне Савета ЕЭК прайшло ўчора ў анлайн-фармаце. Сёлета ў органах ЕАЭС старшынстве Беларусь, Савет ЕЭК узначальвае **віцэ-прэм'ер Наталля ПЯТКЕВІЧ.**

На пасяджэнні Савета ЕЭК былі ўдакладнены працэдуры рэгістрацыі пры неабходнасці ўключэння новага віду медвырабу ў глабальную наменклатуру медыцынскіх вырабаў і ў наменклатуру медыцынскіх вырабаў Еўразійскага эканамічнага саюза. «Адкарэктаваны пералік дакументаў для рэгістрацыі медвырабаў нізкіх класаў патэнцыяльнай рызыкі і для in vitro дыягностыкі, — растлумачылі ў ЕЭК. — Прынятыя папраўкі дадуць магчымасць аптымізаваць працэдуру рэгістрацыі і экспертызы медыцынскіх вырабаў, устаноўленую правам ЕАЭС».

Таксама стала вядома, што ў Еўразійскім эканамічным саюзе ўводзіцца маркіроўка чорнай і чырвонай ікры, веласіпедаў, змазачных масел і антысептыкаў. Адпаведнае рашэнне прынята Саветам ЕЭК. «Савет Еўразійскай эканамічнай камісіі, разгледзеўшы ініцыятыўныя прапановы Расійскай Федэрацыі, прыняў рашэнні аб устанаўленні агульных правілаў лічбавай маркіроўкі адносна шэрагу новых катэгорый тавараў. У прыватнасці, размова ідзе аб ікры асятровых і ласасёвых рыб, веласіпедах і веласіпедных рамах, асобных відах змазачных масел, змазачных матэрыялаў і спецыяльных аўтамабільных вадкасцяў, касметычнай прадукцыі з антымікробным дзеяннем, а таксама сродкаў дэзінфекцыі», — растлумачылі ў ЕЭК.

«Пашырэнне колькасці тавараў, якія маркіруюцца, сведчыць аб развіцці агульнай сістэмы маркіроўкі саюза, што дае магчымасць перакanaцца ў сапраўднасці прадукцыі для спажыўцоў, а таксама павышае канкурэнтаздольнасць добрасумленных удзельнікаў рынку за кошт змяншэння незаконнага абароту», — адзначыў **член Калегіі (міністр) па гандлі ЕЭК Андрэй СЛЯПНЁЎ.** Ён падкрэсліў, што маркіроўка новых груп тавараў будзе праводзіцца, як і раней, па ўніфікаваных правілах. Пры гэтым улічваюцца палажэнні базавай тэхналагічнай арганізацыйнай мадэлі сістэмы маркіроўкі тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі ў ЕАЭС, зацверджанай рашэннем Савета ЕЭК ад 5 сакавіка 2019 года. Такім чынам будзе забяспечвацца ўзаемнае прызнанне кодаў, што выключыць неабходнасць перамаркіроўкі тавараў пры іх абарачэнні на тэрыторыі саюза.

НА СЛЫХУ

# НОВЫЯ ШТРЫХІ

## Да 1 лістапада прадугледжаны тэставы рэжым для гандлю па новых правілах счытвання маркіроўкі



**Да 1 лістапада прадугледжаны тэставы рэжым для гандлю па новых правілах счытвання кода маркіроўкі. Пра гэта паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кантролю рэалізацыі тавараў і паслуг — начальнік упраўлення электронных сістэм кантролю Міністэрства па падатках і зборах Вячаслаў МАЙКОЎСКІ.**

З 1 ліпеня 2025 года юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны забяспечыць дыферэнцыраваны ўлік даных аб рэалізуемых таварах, якія падлягаюць маркіроўцы; перайсці на выкарыстанне касавага абсталявання, што адпавядае патрабаванням заканадаўства. У асобных крамах загадзя пачалі тэсціраваць працэсы счытвання кода маркіроўкі, але ў цэлым суб'екты аказаліся не гатовыя да нововаўвядзенняў.

Каб мінімізаваць складанасці, урад і Нацыянальны банк перагледзелі патрабаванні да работы касавага абсталявання. Выключана неабходнасць сканіравання нацыянальнага QR-кода, якім цяпер маркіруецца большасць тавараў, у тым ліку паўсядзённага попыту. У дачыненні да прамаркіраваных тавараў (малочная прадукцыя, абутак, шыны і асобныя тавары лёгкай прамысловасці — верхняе адзенне, бялізна сталовая, пасцельная і кухонная) у большасці выпадкаў захаваецца абавязак па сканіраванні толькі міжнароднага QR-кода, паколькі ён уключае ў сябе GTIN. Гэта зроблена для зніжэння нагрузкі на бізнес, для зручнасці пакупнікоў.

Цяпер падчас продажу сокаў, напояў, кансерваў і іншых тавараў можна счытваць толькі штрыхавы код, калі ёсць дыферэнцыраваны ўлік, а пры яго адсутнасці і гандлі толькі гэтымі таварамі ў невялікай краме — проста ўводзіць суму адзінкі тавару.

Што датычыцца тавараў, якія маркіруюцца сродкамі ідэнтыфікацыі, патрабаванні захаваліся. Пры іх продажы трэба счытваць код маркіроўкі, забяспечваць дыферэнцыраваны ўлік і прадаваць гэты тавар паштучна. Пералік такіх тавараў карацейшы, чым тых, што падлягаюць маркіроўцы ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі. У першую чаргу гэта малочная прадукцыя. Сюды ж адносяцца абутак, шыны, асобныя прадметы адзення, бялізна сталовая, пасцельная і кухонная.

«Прынята рашэнне, што да 1 лістапада будзе дзейнічаць тэставы рэжым. Разам з тым патрабаванні выконваць трэба, але ад іх можна адступаць, калі па аб'ектыўных прычынах не змаглі выканаць (адклеілася маркіроўка, не счытваецца код і інш.). Мы даём магчымасць прыстасавацца да новых умоў, а ад суб'ектаў гандлю чакаем інфармацыі аб праблемах», — адзначыў Вячаслаў Майкоўскі.

Ён асабліва падкрэсліў, што за невыкананне правілаў на першым этапе — у перыяд тэсціравання — падатковыя органы штрафаваць не будуць.

У далейшым для многіх тавараў прадугледжаны паэтапны пераход на новую сістэму.

**Паводле БелТА.**

# РАНЕЦ З ДАПАМОГАЙ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У прыватнасці, толькі ў Брэсцкай вобласці аднаразовую матэрыяльную дапамогу плануюць аказаць звыш 24 тысячам шматдзетных бацькоў, якія выхоўваюць больш як 51 тысячу хлопчыкаў і дзяўчынак. Для гэтага ў мясцовых бюджэтах прадугледзелі 7,7 мільёна рублёў.

## КАМУ, КОЛЬКІ І КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА?

Пра віды матэрыяльнай дапамогі да школы, каму яна даецца і куды па яе трэба звяртацца, пра памеры выплат расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Дапамогу выплачваюць шматдзетным сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, незалежна ад даходу сям'і. Памер выплаты на кожнае дзіця школьнага ўзросту — 30 % БПМ, што будзе дзейнічаць на 1 жніўня. Грошы прызначаны для пакупкі адзення, абутку, канцылярскіх прылад. Звяртацца па такі від дапамогі варта ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання) аднаго з бацькоў дзіцяці, а ў Мінску, асобных раёнах Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей — па месцы вучобы дзіцяці.



Акрамя таго, бацькі, якія выхоўваюць дзяцей-школьнікаў, могуць разлічваць на фінансавую дапамогу да навучальнага года па месцы работы ў адпаведнасці з калектыўнымі дагаворамі, іншымі лакальнымі актамі. Падтрымку сем'ям гатовы аказаць прафсаюзы. Напрыклад, у мінулым годзе за кошт сродкаў наймальнікаў і прафсаюзных арганізацый такую дапамогу атрымалі 15,2 тысячы сем'яў Брэсцкай вобласці. Дарэчы, матэрыяльная дапамога да школы пераводзіцца на базавы рахунак.

## ДАБРАЧЫННЫЯ АКЦЫІ

У ліпені-жніўні па ўсёй краіне пройдуць дабрачынныя акцыі, арганізаваныя ТЦСАН, фондамі і грамадскімі аб'яднаннямі, напрыклад «Школьны ранец», «Збяры дзіця ў школу», «У школу з усмешкай», «Партфель першакласніка». У Віцебскай вобласці ўжо стартавала штогадовая дабрачынная акцыя «У школу — разам!» Яе арганізатарам выступае Віцебскае абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду. Акцыя працягнецца да 30 верасня. Звярнуцца па дапамогу можна ў мясцовы ТЦСАН, дабрачынныя арганізацыі.

Ужо больш за 20 гадоў работнікам, якія выхоўваюць школьнікаў, дапамагаюць збіраць партфелі ў школу і прафсаюзы. «Першы раз — у першы клас», «Збяром партфель першакласніку», «У школу з Добрым Сэрцам», «Дабрыня не мае меж», «Добры дзень, школа!» — усе гэтыя акцыі з'яўляюцца часткай дабрачыннага марафону Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Прафсаюзы — дзецям», які ахоплівае ўсе рэгіёны нашай краіны. Акцыя ініцыяваная самай масавай грамадскай арганізацыяй у 2002 годзе, і з кожным годам яе маштабы толькі павялічваюцца.

Ва ўсіх гарадах і раёнах Брэстчыны таксама будуць праводзіць акцыі па зборы школьных прылад, адзення, абутку і грошай.

**Алена КРАВЕЦ.**

### Законным прадстаўнікам школьнікаў неабходна падаць наступны пакет дакументаў:

- заяву аднаго з бацькоў (афармляецца падчас падачы дакументаў);
- пашпарт або від на жыхарства абаіх бацькоў;
- даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і;
- арыгінал і копію пасведчання шматдзетнай сям'і (у выпадку адсутнасці пасведчання шматдзетнай сям'і — пасведчанні аб нараджэнні ўсіх непаўналетніх дзяцей);
- на кожнага школьніка ў сям'і патрэбна даведка аб тым, што дзіця з'яўляецца навучэнцам установы агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі (на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі) — з пазначэннем класа на 1 верасня 2025 года;
- нумар базавага рахунку для пералічэння матэрыяльнай дапамогі.

### Каму выплачваюць:

шматдзетным
і малазабяспечаным сем'ям



### Віды дапамог:

- аднаразовая матэрыяльная дапамога;
- дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога;
- дапамога па месцы работы бацькоў;
- дабрачынная дапамога.

### Куды звяртацца:

у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне;
па месцы вучобы дзіцяці;
у службу «адно акно» мясцовага выканаўчага і распарадчага органа;
па месцы работы бацькоў;
у мясцовы ТЦСАН;
дабрачынныя арганізацыі.

АДНО СЛУЖБА АКНО



### Памер выплаты:

30 % БПМ
на кожнае
дзіця-школьніка.


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Экзито прайм»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2084 | Цистерна 25 м. куб., инв. № 92 | 2400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 2085 | Емкость 25 м. куб., инв. № 93 | 2400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 2086 | Автомобиль Нива 21214, рег. знак. 4577 ВР-2, кузов (рама) XTA212140A1961702, 2010 г. вып., инв. № 73 | 5664,00 | 566,40 | 283,20 |
| 2088 | Прицеп МАЗа 857100 4022, зав. № УЗМ8570090006019, рег. знак. А 1760 А-2, 2009 г. вып., инв. № 76 | 2016,00 | 201,60 | 100,80 |
| 2089 | Машина для внес. орган. удобрен. ПРТ-7А, инв. № 85 (без док.) | 5664,00 | 566,40 | 283,20 |
| 2090 | Трактор «Беларус-3022 ДЦ», инв. № 327 (без док.) | 15648,00 | 1564,80 | 782,40 |
| 2091 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 296 (без док.) | 6432,00 | 643,20 | 321,60 |
| 2092 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 297 (без док.) | 6432,00 | 643,20 | 321,60 |
| В отношении лотов проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 18.06.2025 | | | | |
| **Местонахождение:** Витебская обл., Браславский р-н, аг. Межаны | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **22 июля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 9 июля 2025 года до 16.00 18 июля 2025 года | | | |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Экзито прайм», проводимых 22.07.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 2084, 2085, 2088 – 9 %, по лотам №№ 2086, 2089, 2091, 2092 – 8 %, по лоту № 2090 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 304-25-60 Андрей (пн – пт с 09.00 до 18.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «Экзито прайм» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 8 (029) 576 77 15, kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., аг. Межаны, ул. Школьная, д. 1, УНП 391883426)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
9 ліпеня 2025 г. № 24 (805)

# ВОБЛАСЦІ ПЛЁННАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА




**Падводзім вынікі XII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі разам з кіраўнікамі абласных Саветаў дэпутатаў**

Кожны раз Форум рэгіёнаў Саюзнай дзяржавы задае новы вектар узаемаадносін, дае глебу для разважанняў і дапамагае ўмацаваць сувязі паміж нашымі краінамі. Сёлета ён праходзіў у Ніжнім Ноўгарадзе, удзельнікамі форуму сталі больш за 800 прадстаўнікоў усіх абласцей Беларусі і 79 рэгіёнаў Расіі. Было падпісана мноства пагадненняў, зацверджаны планы мерапрыемстваў, заключаны камерцыйныя кантракты і падпісаны іншыя важныя дакументы для ўмацавання супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй у самых розных галінах. У складзе беларускіх рэгіянальных дэлегацый абавязкова прысутнічаюць кіраўнікі абласных Саветаў дэпутатаў. Іх мы і папрасілі расказаць аб выніках форуму.

***



**Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Ігар БРЫЛЕВІЧ** у ходзе работы адной з секцый форуму падзяліўся вопытам супрацоўніцтва аблсавета з органамі заканадаўчай улады суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Падпісаны таксама двухбаковыя дакументы, накіраваныя на ўмацаванне міжрэгіянальных сувязяў: пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Брэсцкім абласным Саветам дэпутатаў і Саратаўскай абласной Думай, а таксама з Заканадаўчым Сходам Свярдлоўскай вобласці.

У трэці дзень форуму было заключана трохбаковае пагадненне аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні паміж Брэсцкім абласным Саветам дэпутатаў, Брэсцкай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў, Асацыяцыяй прадстаўнічых органаў муніцыпальных утварэнняў Ніжагародскай вобласці пры Заканадаўчым Сходзе.

Ігар Брылевіч адзначыў, што падпісанне стала вынікам канструктыўнага дыялогу і зацікаўленасці ў развіцці сувязяў паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі. «Наша супрацоўніцтва з Заканадаўчым Сходам Ніжагародскай вобласці даўно і паспяхова развіваецца, — адзначыў ён. — Падпісаны дакумент — пагадненне паміж асацыяцыямі, якія створаны ў муніцыпалітэтах і раённых саветах. Менавіта гэтыя ўтварэнні будуць рэалізоўваць нашы дамоўленасці на месцах, у тым ліку надзвычай важныя праекты, такія, напрыклад, як сумеснае суднабудаванне, дзе ніжагародскія калегі аказваюць нам істотную падтрымку».

***



«Форум рэгіёнаў, які сёлета праводзіўся ў дванаццаты раз, стаў добрай традыцыяй, на аснове якой будуецца і развіваецца наша Саюзная дзяржава, — лічыць **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ**. — Узаемадзеянне на ім адбываецца па ўсіх кірунках, у першую чаргу, гэта эканоміка. Акрамя таго — развіццё сацыяльных, гуманітарных сувязяў, маладзёжных арганізацый.

Дзясяткі прадпрыемстваў Віцебшчыны яшчэ на этапе падрыхтоўкі да форуму заключылі дагаворы з расійскімі партнёрамі на суму звыш 300 мільёнаў долараў. Канчатковыя вынікі перагавораў у Ніжнім Ноўгарадзе пакуль не падведзеныя, бо заключэнне кантрактаў — працэс, які выходзіць за рамкі непасрэднага правядзення мерапрыемства».

Форум — сур'ёзны інструмент для развіцця нашага экспартнага патэнцыялу, Найбольш цесна Віцебская вобласць узаемадзейнічае з суседнімі Пскоўскай і Смаленскай абласцямі Расіі. Актыўна развіваюцца адносіны з Падмаскоўем, Бранщынай, Карэліяй, іншымі расійскімі рэгіёнамі. У рамках XII Форуму рэгіёнаў Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з Ленінградскай, Ульянаўскай, Арлоўскай абласцямі. Віцебскі аблсавет падпісаў шэсць падобных дакументаў. Дамоўленасці ахопліваюць усе сферы: эканоміку, сацыяльную сферу, культуру, маладзёжную палітыку. «Цяперашняя актыўная работа з расіянамі — вынік, у тым ліку, папярэдняга форуму, які праходзіў у Віцебску, Полацку і Наваполацку, — нагадаў дэпутат. — Расіяне з вялікай цеплынёй і энтузіязмам згадвалі леташнія сустрэчы».

***



«Форум рэгіёнаў дазваляе пашырыць нашы магчымасці і выйсці на новы ўзровень інтэграцыі ў эканамічных і гуманітарных адносінах, — лічыць **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Кацярына ЗЕНКЕВІЧ**. — Нашым абласным Саветам дэпутатаў заключана 15 двухбаковых дакументаў аб супрацоўніцтве з органамі заканадаўчай улады расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку два — на XII Форуме: з Кастрамской і Сахалінскай абласнымі думамі. Гэта садзейнічае абмену вопытам ў галіне прававога рэгулявання, сацыяльна-эканамічнага развіцця, мясцовага самакіравання, а таксама ў гуманітарнай сферы».

Кацярына Зенкевіч прадстаўляла на форуме ў Ніжнім Ноўгарадзе міжпарламенцкае супрацоўніцтва Гомельскай вобласці з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі па захаванні гістарычнай памяці. «У сучасным свеце ў супрацоўніцтве вялікую ролю выконвае народная дыпламатыя, асновай якой з'яўляецца ўзаемадзеянне паміж парламентарыямі, — кажа сенатар. — Мы абавязаны рабіць усё для паляпшэння дабрабыту брацкіх народаў, і задача дэпутатаў — максімальна садзейнічаць стварэнню роўных умоў і гарантый для жыхароў і бізнесу двух краін».

Парламентарый прывяла некалькі прыкладаў сумеснай дзейнасці: Гомельскі абласны Савет дэпутатаў дзяліўся вопытам рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў з Бранщынай, разам з Курскай абласной Думай ужо два гады рэалізуецца літаратурна-творчы конкурс сярод школьнікаў і студэнтаў «Унукі аб вайне», у фармаце анлайн адбылася сустрэча абласнога падлеткавага парламента з навучэнцамі дамоў творчасці Бранскай, Смаленскай і Арлоўскай абласцей, праведзены відэамасты паміж моладдзю, органамі мясцовага самакіравання Гомеля і шэрагу расійскіх гарадоў.

***



**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА** адзначыла:

— З кожным годам геаграфія ўзаемадзеяння рэгіянальнага супрацоўніцтва пашыраецца, што дазваляе абменьвацца вопытам. Форум даў магчымасць сустрэцца з прадстаўнікамі ўсіх рэгіёнаў, з кім раней былі падпісаны пагадненні, а дзякуючы тэлемасту, які адбыўся, ахоп аўдыторыі стаў неверагодна шырокім. Ён працягнуўся ад Гродна да Сахаліна! Гэта ўсё дазваляе ўмацоўваць сяброўства ў Саюзнай дзяржаве, што з'яўляецца вельмі важным аспектам, які дапамагае эфектыўна рэалізоўваць супрацоўніцтва ва ўсіх кірунках. Саюз нашых дзяржаў сапраўды ўнікальны, чагосьці падобнага няма нідзе ў свеце. Адносіны Беларусі і Расіі пабудаваны на сяброўстве, добрасуседстве, гістарычнай памяці і гонары за развіццё нашых дзяржаў. Галоўная задача — захаваць гэта сяброўства і стварыць умовы, якія дазволяць яму мацнець і далей. У рамках форуму былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў і Дзяржаўным Саветам Рэспублікі Комі і Заканадаўчым Сходам Цвярской вобласці.

Зараз ідзе актыўная падрыхтоўка да з'езда малых гарадоў Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей. Алена Пасюта расказала, што лейтматывам мерапрыемства стане 80-годдзе Вялікай Перамогі. Удзельнікі будуць дзяліцца вопытам развіцця аграпрамысловага комплексу, выкарыстання другасных рэсурсаў і захавання экалогіі, гісторыка-культурнай спадчыны. Асобная праграма будзе прысвечана моладзі. На пляцоўцы органаў мясцовага кіравання і самакіравання будуць абмяркоўвацца механізмы ўніфікацыі заканадаўства Беларусі і Расіі, якая дасць магчымасць больш эфектыўна рэалізоўваць сумесныя праекты.

***

Па выніках форуму Магілёўскім аблсаветам падпісаны План мерапрыемстваў на 2025—2026 гады па рэалізацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве з Мурманскай абласной Думай і Пагаднення аб супрацоўніцтве з Заканадаўчым Сходам Пензенскай вобласці. Наогул Магілёўскім аблсаветам заключана ўжо 17 пагадненняў з расійскімі рэгіёнамі. Цесныя кантакты наладжаны з Мурманскам, Рэспублікай Адыгея, Псковам, Уладзімірам і іншымі.

— Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Ніжнім Ноўгарадзе стаў важнай падзеяй для Магілёўскай вобласці, — падзяліўся меркаваннем з карэспандэнтам «МС» **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі**



**Аляксандр ГАРОШКІН**. — Ён дазволіў умацаваць існыя сувязі, знайсці новых партнёраў, прыцягнуць інвестыцыі, абмяняцца вопытам.

— Нягледзячы на дасягнутыя вынікі, мы ўвесь час шукаем новыя пункты росту і ўзаемавыгадныя кірункі для сумеснай работы, — адзначыў Аляксандр Гарошкін. — Мы дэманструем усяму свету згуртаванасць брацкіх народаў, пашыраем сацыяльна-эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва, наладжваем культурныя і спартыўныя сувязі, забяспечваем кааперацыю на рынку вытворчых, інвестыцыйных і працоўных рэсурсаў, ажыццяўляем узаемадзеянне ў маладзёжнай палітыцы і захоўваем агульную гістарычную памяць.

***



**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Наталля ЯКУБІЦКАЯ** расказала, што скарбонка агульных пагадненняў ужо даволі ёмістая: «Так, на мінулых форумах мы заключылі пагадненні аб супрацоўніцтве з Татарстанам і Дагестанам. Дарэчы, яшчэ да самога форуму да нас прыязджала дэлегацыя Татарстана, і пасля паспяховага візіту да нас пачалі звяртацца прадстаўнікі іх парламента. Што датычыцца апошняга мерапрыемства, мы падпісалі чатыры пагадненні аб супрацоўніцтве. Гэта пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым Сходам Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі, з Бранскай абласной Думай, Заканадаўчым Сходам Кемераўскай вобласці — Кузбаса і Сахалінскай абласной Думай».

У рамках падпісаных пагадненняў бакі маюць намер абменьвацца вопытам заканатворчай дзейнасці, праводзіць сумесныя мерапрыемствы, развіваць інфармацыйнае ўзаемадзеянне і ўсталёўваць прамыя кантакты паміж дэпутатамі, а таксама маладзёжнымі парламентамі.

Наталля Якубіцкая адзначыла, што плённыя адносіны паміж Мінскім абласным Саветам і Кузбасам пачаліся яшчэ да падпісання пагадненняў, да пачатку форуму: «У рамках візіту дэлегацыя Кемераўскай вобласці сустракалася з нашым кіраўніком дзяржавы. Карыстаючыся выпадкам, тады ў вузкім фармаце мы абмеркавалі магчымасці нашага далейшага супрацоўніцтва».

Сенатар падкрэсліла важную ролю парламентарыяў абедзвюх краін ва ўмацаванні эканамічных і палітычных сувязяў паміж дзяржавамі. У большай меры, паводле яе слоў, менавіта намаганнямі народных выбраннікаў ствараюцца пляцоўкі для работы прадстаўнікоў розных сектараў эканомікі, а таксама ўмовы для ўзаемадзеяння бізнес-колаў.

***



«Вялікая работа была праведзена яшчэ да пачатку XII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — расказаў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН**. — Сустракаючыся з калегамі непасрэдна на палях мерапрыемства, мы замацавалі дамоўленасці, якія былі перад гэтым дасягнуты. На працягу ўсяго года прайшло больш за дзясятак сустрэч з рознымі прадстаўнікамі рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Некаторыя пагадненні былі падпісаны да форуму. У цэлым, можна сказаць, што на дадзеной пляцоўцы адбылося падвядзенне вынікаў плённай работы нашых рэгіёнаў, кіраўнікоў на месцах, кіраўнікоў прадпрыемстваў, прадстаўнікоў органаў улады».

Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў яшчэ звярнуў увагу, што сёлета былі заключаны пагадненні з Ніжагародскай і Екацярынбургскай гарадскімі думамі. «Асноўная мэта іх падпісання — гэта ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва ў галіне мясцовага самакіравання, абмен вопытам. У тым ліку і ў маладзёжнай палітыцы, парламентарызме. У Екацярынбургу гэта работа выбудаваная на вельмі высокім узроўні», — дадаў Арцём Цуран.

Акрамя таго, дагэтуль быў падпісаны шэраг пагадненняў, якім, дзякуючы форуму, будзе нададзены дадатковы імпульс. «У нас маюцца кантакты з Маскоўскай і Севастопальскай гарадскімі думамі», — адзначыў старшыня Мінгарсавета.

Як паведаміў Арцём Цуран, дэлегацыя ніжагародцаў ужо была ў Мінску некалькі разоў, бакі абмяняліся вопытам. У працэсе форуму дэпутаты наведалі аб'екты, якія накіраваны на работу з людзьмі і якія каардынуе Ніжагародская гарадская Дума. Акрамя таго, наведалі мясцовы Суседскі цэнтр — аналаг ТГСаў, якія дзейнічаюць у беларускай сталіцы.

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

АКЦЭНТЫ

# «СУМЕСНЫЯ НАМАГАННІ ДЗЯРЖАВЫ, НАСЕЛЬНІЦТВА, ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ МОГУЦЬ ПРЫВЕСЦІ ДА ЗНАЧНЫХ ЗМЕН ДА ЛЕПШАГА»

## Якія пытанні абмяркоўвалі дэпутаты Міншчыны падчас выязной сесіі

Галоўнай тэмай выязнога пасяджэння сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў стала ўзаемадзеянне органаў мясцовага кіравання, самакіравання, арганізацый і насельніцтва ў рэалізацыі мерапрыемстваў Года добраўпарадкавання. Народныя выбраннікі Міншчыны наведалі Узду і Слуцк, а таксама абмеркавалі работу па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў у гарадскім пасёлку Чырвоная Слабада. Фінальным пунктам маршруту дэпутатаў стала сталіца шахцёраў — горад Салігорск, дзе і прайшло пасяджэнне сесіі. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся падрабязнасці.

**Старшыня Мінскага абласнога Савета Наталля ЯКУБІЦКАЯ** адзначыла: «Для нас, дэпутатаў, навядзенне парадку на зямлі і прывядзенне ў парадак сельскіх населеных пунктаў — адзін з найважнейшых кірункаў дзейнасці. Работа на зямлі, безумоўна, уключае ў сябе і працу з насельніцтвам, і з юрыдычнымі асобамі. Такая практыка ў нас ёсць, і гэтым вопытам варта падзяліцца».

### НАВЯДЗЕННЕ ПАРАДКУ І РАЗВІЦЦЁ ІНІЦЫЯТЫЎ

Уздзенскі раён стаў першым у плане работы выязной сесіі Мінскага аблсавета. Народныя выбраннікі наведалі адно са значных месцаў раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з жыхарамі была спалена вёска Старына. На яе месцы ўстаноўлены помнік, звон, высаджаны дрэвы. Наталля Якубіцкая адзначыла: «Памяць пра мінулае жывая, пакуль мы наведваем абеліскі, падтрымліваючы іх у належным стане. Гэта важна для нашых нашчадкаў».

Пытанні добраўпарадкавання і навядзення парадку на зямлі застаюцца аднымі з прыярытэтных задач для **кіраўніка Дзешчанскага сельсавета Уладзіміра БАЛЦЯНКОВА.** Паводле яго слоў, жыццё ў аграгарадку Дзешчанка і за яго межамі кіпіць дзякуючы ініцыятыўнасці мясцовай супольнасці і эфектыўнай рабоце прадпрыемстваў: «Унёсак апошніх прыкметны не толькі ў эканоміцы, але і ў паляпшэнні інфраструктуры, добраўпарадкаванні і стварэнні камфортнага асяроддзя для пражывання».

Асобную ўвагу надалі культурнаму жыццю рэгёна — у прыватнасці, традыцыйнаму фестывалю «Бульбафэст», якім славіцца гэта мясцовасць. «Дадзенае мерапрыемства не толькі аб'ядноўвае мясцовых жыхароў, але і прыцягвае гасцей, падкрэсліваючы самабытнасць і гасціннасць раёна», — дадаў старшыня сельсавета.



Наступны прыпынак — Слуцк. Тут на набярэжнай Случы ў цэнтры нядаўна прайшла абласная акцыя па добраўпарадкаванні «Квітней, родная Міншчына: твой унёсак важны». Удзельнікі выязной сесіі змаглі ацаніць маштаб праведзенай работы.

«Наведваючы Слуцкі раён, у першую чаргу звярнулі ўвагу на дарогу Р-23 — трасу рэспубліканскага значэння, і мы ў сваю чаргу многае робім для таго, каб падобныя артэрыі Міншчыны знаходзіліся ў ідэальным стане — узаемадзейнічаем з дарожнымі арганізацыямі, сельсаветамі, простымі людзьмі. Разумеем, да нас прыязджае вельмі шмат замежных гасцей. Наша краіна славіцца сваімі прыгажосцю, утульнасцю, чысцінёй, і мы стараемся ўсяляк гэта падтрымаць», — адзначыла Наталля Якубіцкая.

Народныя выбраннікі наведалі таксама мясцовы парк, які стаў улюбёным месцам адпачынку для случчан і гасцей горада дзякуючы грамадзянскім ініцыятывам.

У пасёлку Чырвоная Слабада ўжо Салігорскага раёна цэнтрам увагі таксама стаў мясцовы парк. Падчас наведвання населенага пункта прадстаўнікі дэпутацкага корпуса абмеркавалі работу па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Наталля Якубіцкая назвала пасёлак прыкладам кансалідацыі насельніцтва і ўлады з мэтай добраўпарадкавання: «Калі мы праводзілі абласны суботнік, то асноўнай думкай было звярнуць увагу на малыя населеныя пункты, незалежна ад шчыльнасці насельніцтва, каб людзі заставаліся жыць у сельскай мясцовасці. І гэты парк, і пасёлак Чырвоная Слабада — яркія прыклады таго, як мясцовыя органы ўлады, самакіравання і самі людзі сваімі рукамі ствараюць такія прыгожыя месцы». Старшыня Мінскага абласнога Савета таксама адзначыла і патрыятычную пляцоўку з ваеннай тэхнікай у аграгарадку Кастрычнік (недалёка ад Чырвонай Слабады). З ініцыятывай стварэння экспазіцыі выступілі мясцовыя жыхары, а ўлады падтрымалі.

### «СТВАРЭННЕ КАМФОРТНАГА АСЯРОДДЗЯ — АДНА З КЛЮЧАВЫХ ЗАДАЧ»

Работа выязной сесіі прадоўжылася пленарным пасяджэннем у Салігорскім райвыканкаме. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Міншчыны падкрэсліла значнасць развіцця аграгарадкоў і пасёлкаў гарадскога тыпу: «Важна разумець, што добраўпарадкаванне — гэта не толькі азеляненне тэрыторый або ўстаноўка новых інфраструктурных аб'ектаў. Гэта комплекс мерапрыемстваў, які ўключае ў сябе як фізічнае паляпшэнне аб'ектаў, так і актыўнае ўцягванне насельніцтва ў працэсы зменаў».

**Старшыня Салігорскага райвыканкама Анатоль ЛАДЫГА** прадставіў інфармацыю аб развіцці Салігоршчыны, адзначыўшы, што пасёлкі Чырвоная Слабада і Старобін сталі цэнтрамі прыцягнення дзякуючы актыўнай рабоце па добраўпарадкаванні, распачатай яшчэ ў 2023 годзе: «Салігорскі раён другі па плошчы ў Мінскай вобласці. Адміністрацыйна і тэрытарыяльна раён падзелены на 11 сельсаветаў. Колькасць насельніцтва — больш за 126 тысяч чалавек. Тут маюцца два пасёлкі гарадскога тыпу. І сёння Чырвоная Слабада ды Старобін — цэнтры прыцягнення. 2023 год мы бярэм за аснову адліку, калі пачаліся работы па добраўпарадкаванні. І сёння мы бачым вынік».

Навядзенне парадку і стварэнне камфортнага асяроддзя для жыцця беларускіх грамадзян — адны з ключавых задач, якія стаяць перад арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, **падкрэсліў генеральны дырэктар ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Юрый КУКАШУК:** «Таму пытанне работы з насельніцтвам для нас ніколі не губляе сваёй актуальнасці. Сёння ў сістэме арганізацый, якія ўваходзяць у склад ДА «ЖКГ Мінскай вобласці», выбудаваная сістэма ўзаемадзеяння з насельніцтвам, выпрацаваныя і рэалізуюцца новыя падыходы і метады ў дадзенай рабоце».

Наталля Якубіцкая рэзюмавала, што менавіта сумесныя намаганні дзяржавы, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама насельніцтва могуць прывесці да значных змен да лепшага: «Гэта пасяджэнне стала важнай пляцоўкай для абмену думкамі, выпрацоўкі новых ідэй і, безумоўна, павышэння цікавасці насельніцтва да пытанняў добраўпарадкавання». У заключэнне кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгёна заклікала зрабіць Міншчыну ўзорам для пераймання ў сферы добраўпарадкавання, адзначыўшы значныя поспехі, дасягнутыя ў гэтым кірунку, і неабходнасць далейшага развіцця.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота прэс-службы Мінскага аблвыканкама.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7988205136, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, 6/3-2. Площадь: 2921,1 кв. м. Наименование: Производственное помещение. Назначение: Производственное помещение. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 557 440,00** | **Задаток, BYN** | **255 744,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340 E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона, на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений а участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 28 июля 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **29 июля 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

**Брестский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-54093 (наименование: свинарник маточный; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 853,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, район д. Тельмы-1, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027596, площадью 0,4780 га, составные части и принадлежности: 3 тамбура

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **185 000,00** | **Размер задатка, руб.** | **18 500,00** |

**Продавец:** ОАО «Брестский аграрий», 225003, Брестская обл., Брестский р-н, д. Тельмы-1, ул. Депутатская, 2, тел. 80162549233. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 12 августа 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by**, а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 11 августа 2025 г. до 17.00**

# «ПРАПАНОВЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ ДАПАМАГАЮЦЬ УДАСКАНАЛЬВАЦЬ ЗАКАНАДАЎСТВА»

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег ЦЫЛЬКО дзеліцца сваім вопытам работы ў Рэчыцкім раёне

У дэпутацкую акругу намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па экалогіі і прыродакарыстанні Алега Цылько ўваходзяць горад Рэчыца, гарадскі пасёлак Зарэчча і пяць сельскіх саветаў: Жмураўскі, Азершчынскі, Перасвятоўскі і Салтаноўскі.



Аснову эканомікі ўсяго Рэчыцкага раёна складае прамысловасць. Вядучыя прадпрыемствы тут — Рэчыцкі завод вырабаў з металу, мэблевая фабрыка «Рэчыцадрэў», «Беларуснафта-Прамсэрвіс», «Рэчыцкі камбінат хлебапрадуктаў», «Рэчыцкі тэкстыль», хлебазавод. Раён славіцца сваімі нафтавікамі. У горадзе працуюць тры каледжы: аграрны, тэхнічны і педагагічны. Маецца выдатны гарадскі палац культуры, музычная школа і школа мастацтваў, краязнаўчы музей, цэнтр культуры і народнай



творчасці, амфітэатр на набярэжнай Дняпра, лыжаролерная траса...

— Горад бурлівы, — расказвае дэпутат. — Людзі звяртаюцца да мяне як дэпутата Палаты прадстаўнікоў з самымі рознымі пытаннямі і прапановамі. Традыцыйна ўвесну ўстае праблема рамонту дарог, дваровых тэрыторый, вывазу смецця. Праз два тыдні пасля абрання прыйшлі жыхары сядзібнай забудовы «Верталётная пляцоўка», выязджаў туды, аглядаў маштабы затаплення. У тым ліку і па маёй просьбе ўлады аператыўна і бесперапынна адкачвалі ваду, а цяпер робяць дрэнажную сістэму, каб падобнае не паўтаралася.

Роля прадстаўнічай улады ў такіх сітуацыях заключаецца ў тым, каб інтарэсы простых людзей былі ўлічаныя і абароненыя своечасова, кажа Алег Цылько. Дэпутат парламента таксама дапамагае вырашыць праблемы, калі для гэтага не хапае паўнамоцтваў на ўзроўні раёна.

— Неяк на прыём прыйшоў былы вайсковец, які перанёс інсульт, — прыводзіць прыклад суразмоўнік. — Яго хвалявала аплата бальнічнага. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пацвердзіла, што сапраўды ў гэтым пытанні ваенныя пенсіянеры, якія працуюць, ушчэмлены. Цяпер міністэрства разглядае магчымасць унясення змяненняў у парадак аплаты бальнічных гэтай катэгорыі грамадзян.

Вясной Алег Цылько вывучаў у акрузе практыку прымянення заканадаўства ў землеўпарадкавальнай службе. Падчас падрыхтоўкі змяненняў у Кодэкс аб адукацыі рэчыцкія настаўнікі агучвалі пытанні дастаўкі вучняў школьным транспартам не толькі на заняткі, але і на трэніроўкі, экскурсіі. Менавіта ініцыятывы знізу дапамагаюць зрабіць адпаведныя праекты законаў больш дасканалымі, падкрэслівае дэпутат.

— Месяц таму звярнуўся выбаршчык з прапановай усталяваць у горадзе памятны знак у гонар віцэ-адмірала Георгія Халасцякова, Героя Савецкага Саюза, які некаторы час жыў у Рэчыцы, — згадвае прыклад яшчэ аднаго роду зваротаў Алег Цылько. — У горадзе ёсць вуліца ў імя Георгія Халасцякова, на ёй і прапанавана размясціць мемарыяльную дошку. Пытанне вырашаецца разам са старшынёй райвыканкама і аддзелам культуры.

Свежы прыклад вырашанага пытання — дапамога ў асфальтаванні пляцоўкі ў Рэчыцы для навучання кіраванне матацыклам падлеткаў ад 10 да 15 гадоў. У красавіку з просьбай аб гэтым звярталася да дэпутата майстар вытворчага навучання ДТСААФ раёна.

— Гэту секцыю наведваюць дзеці са шматдзетных сем'яў, падлеткі, якія знаходзяцца на прафілактычным уліку, бо спорт — дзейная альтэрнатыва кепскай кампаніі, — заўважае намеснік старшыні парламенцкай камісіі. — Па маім хадайніцтве Прэзідыумам Цэнтральнага савета ДТСААФ прынята рашэнне аб выдзяленні 20 тысяч рублёў на рамонт пляцоўкі ў Рэчыцы, пяць тысяч выдзеліла вобласць. Астатнюю суму паабяцаў райвыканкам.

З філіялам «Рэчыцаводаканал» дэпутат прапрацаваў пытанні аб забеспячэнні чыстай якаснай вадой жыхароў аграгарадка Перасвятое, водазабеспячэння аграгарадка Салтанова.

— Больш за палову ўсіх зваротаў, якія паступілі да мяне як дэпутата парламента, удалося вырашыць станоўча. Гэта было б немагчыма без узаемаразумення з райвыканкамам і райсаветам, — адзначае народны абраннік. — Астатнія пытанні патрабавалі тлумачэння, некалькі застаюцца на кантролі.

Работа ў акрузе складаецца з прыёму грамадзян, правядзення прамых тэлефонных ліній, сустрэч з працоўнымі калектывамі, удзелу ў розных мерапрыемствах.

— Абавязкова бываю ў кожным сельсавеце. У чэрвені выязджаў на мясцовыя пляжы, знаёміўся з аснашчэннем выратавальнай станцыі, гутарыў з супрацоўнікамі АСВОДу, МНС, Інспекцыяй па справах непаўналетніх. Наведаў школьныя і спартыўныя лагеры, даведаўся, якая ў іх праграма работы з дзецьмі, — расказаў Алег Цылько.

Парламентарый мае багаты вопыт работы з моладдзю. Да свайго абрання працаваў першым сакратаром Акцябрскага раённага камітэта БПСМ, другім сакратаром Гомельскага абласнога камітэта БРСМ, узначальваў аддзел па справах моладзі аблвыканкама.

— Тут важна пазбягаць заарганізаванасці, быць самім сабой, шчырым, — дзеліцца парламентарый. — Тады атрымаецца данесці інфармацыю, якой павінен валодаць кожны беларус. Напрыклад, пра тое, што мы робім легкавыя аўтамабілі, а ў наступным годзе пабудуем свой самалёт. Або дзе знаходзіцца БЕЛАЗ ці якую маем карысць ад уласнай АЭС... Неабходна, каб моладзь ведала, чым па праве можа ганарыцца. Не толькі прыроднай сваёй Радзімы, але і вытворчасцю сусветнага ўзроўню, культурай, духоўнасцю.

Алег Цылько адзначае, што маладыя людзі ў Рэчыцы досыць разнявоьленыя, выхаваныя эрудыты. У большасці не шукаюць лепшай долі ў іншых мясцінах. Праўда, ёсць пэўны перакос убок нафтаперапрацоўчай прамысловасці, дзе заробкі больш, але і праца цяжкая.

З падачы свайго памочніка, члена Маладзёжнага савета пры Палаце прадстаўнікоў Арцёма Лапаціна напярэдадні Дня моладзі парламентарый правёў анлайн-канферэнцыю на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы. Тады і прагучала прапанова ад маладога выбаршчыка пабудаваць гульнявую пляцоўку на тэрыторыі акругі, дэпутат яе падтрымаў, цяпер вядзе перагаворы з мясцовымі ўладамі.

«Такая форма зносін апраўдала сябе, і я прапаную мясцовым органам улады больш актыўна карыстацца ёю», — рэзюмуе Алег Цылько.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества в связи
с неоплатой жилищно-коммунальных услуг.

**Электронные торги состоятся 12.08.2025 в 11.00**

**Лот № 1:**
19/100 долей в праве собственности на изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-156653 (наименование – квартира, общая пл. – 92,6 кв. м), расположенное по адресу:
г. Минск, ул. Пуховичская, д. 13, кв. 15.
Начальная цена без учета НДС – 43 000,00 руб.
Задаток – 4 300,00 руб.

**Лот № 2:**
7/50 долей в праве собственности на изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-153458 (наименование – Квартира № 17, общая пл. – 102,9 кв. м), расположенное по адресу:
г. Минск, ул. Пуховичская, д. 5, кв. 17.
Начальная цена без учета НДС – 34 900,00 руб.
Задаток – 3 490,00 руб.

Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Продавец – Администрация Октябрьского района г. Минска.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **08.08.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 12 августа 2025 г.**

**Лот № 1:**
**Здание одноквартирного жилого дома**
с инв. № 600/С-106123, площадь 212,2 кв. м.
Начальная цена без учета НДС – 543 000,00 бел. руб.
Задаток – 54 300,00 бел. руб.

Капитальное строение с инв. № 600/С-106123 расположено на земельном участке с кадастровым номером 623680601101001439, площадь (га): 0,2450. Право аренды. Срок действия: с 22.11.2023 по 02.10.2122.

**Адрес:** Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. Речная, 25

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **08.08.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества
в связи с неоплатой жилищно-коммунальных услуг.

**Электронные торги состоятся 23.07.2025 в 11.00**

**Лот № 1:**
Квартира № 8 с инвентарным номером 500/D-90001 (общая пл. – 50,1 кв. м, число комнат – 2),
расположенная по адресу: г. Минск, ул. Грицевца, д. 5, кв. 8.
Начальная цена без учета НДС – 188 000,00 руб.
Задаток – 18 800,00 руб. Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Продавец – Администрация Партизанского района г. Минска.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **21.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» форма 2РН, 2РП серия БИ № 1941782 – 1 шт. УНП 100782388

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-5676 (наименование: Квартира № 1 в блокированном жилом доме; назначение: Квартира), площадью 102,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новосёлковский с/с, д. Титковщина, ул. Центральная, 18-1 | 18 000,00 | 1 800,00 |
| **Лот № 2:** изолированное помещение с инвентарным номером 111/D-5677 (наименование: Квартира № 2 в блокированном жилом доме; назначение: Квартира), площадью 79,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новосёлковский с/с, д. Титковщина, ул. Центральная, 18-2 | 14 600,00 | 1 460,00 |

**Продавец:** ОАО «Путь новый», Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Новосёлки, ул. Центральная, 14, тел./факс 801633 3 17 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** оплата Объекта в день заключения договора. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 12 августа 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 11 августа 2025 г. до 17.00**



Могилевский филиал
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Бобруйский завод КПД» на праве собственности**

**Аукцион состоится 23.07.2025 в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

**Лот № 1: Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77090,** пл. – 1 423,2 кв. м, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002357 (пл. – 0,2551 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 1А.
**Начальная цена продажи: 194 400,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 19 440,00 бел. руб.**

**Лот № 2: Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77093**, пл. – 279,9 кв. м, с цокольным этажом, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002359 (пл. – 0,0893 га, право аренды) по адресу: Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 3А.
**Начальная цена продажи: 41 200,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 4 120,00 бел. руб.**

**Лот № 3: Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 710/U-77096**, пл. – 234,2 кв. м, с цокольным этажом, назначение: Здание неустановленного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000002002361 (пл. – 0,0969 га, право аренды) по адресу: г. Бобруйск, ул. Днепровской флотилии, 5А.
**Начальная цена продажи: 39 200,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 3 920,00 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 22.07.2025 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Бобруйский завод КПД», УНП 700016179, Могилёвская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 130.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**



Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»!
25 июля 2025 года в 11.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров.

Место нахождения Общества: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Повестка дня собрания: О выплате дивидендов.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Лещинская, 49 (актовый зал).

Время регистрации в день проведения собрания – с 10.30 до 11.00.

Для регистрации при себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 17.07.2025 в рабочие дни с 11.00 до 13.00, в день проведения собрания – с 9.00 до 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров – 15.07.2025, определена решением наблюдательного совета от 07.07.2025.

Справки по телефону 8 (0232) 341817.

Наблюдательный совет.

УНП 400078768


# ПАРАДАК У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## У Гродзенскай вобласці абмеркавалі добраўпарадкаванне на месцах на прыкладзе Дзятлаўскага раёна

ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

**Выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў па прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, сувязі, жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадарцы адбылося ў Дзятлаўскім раёне. Удзельнікі прааналізавалі вопыт работы мясцовых улад па добраўпарадкаванні і паляпшэнні якасці жыцця насельніцтва, а таксама змаглі ўбачыць усё на свае вочы. Як расказала старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА, Дзятлаўскі раён пакінуў пасля сябе прыемныя ўражанні.**



У Дзятлаве ўдзельнікі пасяджэння сабраліся, каб абмяняцца вопытам, пазнаёміцца з падыходамі, якія прымяняюцца ў розных раёнах Гродзенскай вобласці. Падобныя сустрэчы дазваляюць пазначыць праблемныя пытанні і знайсці шляхі іх вырашэння.

— Удзельнікі пастараліся пачуць адно аднаго, зразумець сутнасць агучаных прапаноў, а ўсе рацыянальныя ідэі абавязкова будуць улічаны ў далейшай рабоце. Асаблівая ўвага — жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Азнаёміліся з тым, як яна арганізавана, якім чынам ідзе ўзаемадзеянне з насельніцтвам, як выбудоўваецца зваротная сувязь, — расказала Алена Пасюта.

Але на адной прыгажосці досвед раёна з насельніцтвам каля 22 000 чалавек не канчаецца. Так, больш як 70 % бюджэту фарміруецца за кошт уласных даходаў. Іх фарміруе прамысловасць раёна, якая прадстаўлена 10 прадпрыемствамі, іх доля ў эканоміцы рэгіёна — 60 %. Гэта вынік планамернай працы. Для параўнання: у 2020 годзе ўдзельная вага ўласных даходаў была крыху больш за 50 %, а цяпер — 75 %.

— Гэты рэсурс з'яўляецца ключавым для нас, — зазначыў **старшыня Дзятлаўскага райвыканкама Андрэй САДОЎСКІ.** — Наш поспех у рэалізацыі інвестыцыйных праграм непарыўна звязаны з рэгулярным папаўненнем бюджэту з прафіцытам. У сярэднім нашы ўласныя прыбыткі складаюць каля 60 мільёнаў рублёў. Летась яны склалі 49 мільёнаў. Штогадовы рост даходаў — каля 11 мільёнаў, што забяспечвае дастатковыя сродкі для пакрыцця ўсіх абавязковых расходаў і фарміравання рэзервовага фонду.

## СТВАРЭННЕ НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

У рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект» асаблівая ўвага — рэалізацыі інвестыцыйных ініцыятыў. Усе яны накіраваны на стымуляванне эканамічнага росту, стварэнне новых працоўных месцаў і павышэнне якасці жыцця жыхароў рэгіёна. Так, у ТАА «Ізакам Пласт» была запушчана вытворчасць папярэднеізаляваных і водаправодных труб, што спрыяла стварэнню 20 новых працоўных месцаў. Агульны аб'ём інвестыцый у праект склаў каля 7 мільёнаў рублёў.

У пасёлку гарадскога тыпу Навальня адбываецца абнаўленне завода па вытворчасці раслінных алеяў. У рамках праграмы паляпшэння ўмоў жыцця ў раёне праводзіцца вялікая работа па абнаўленні і развіцці інфраструктуры. У першую чаргу сродкі накіроўваюцца на паляпшэнне сацыяльнай сферы, уключаючы ахову здароўя, адукацыю і жыллёва-камунальную гаспадарку. У цэнтральнай раённай бальніцы абсталююць кабінеты для правядзення рэнтгенаграфіі і мамаграфіі. У адукацыйных установах рамантуюць дахі, а ў жылых дамах праводзяць капітальны рамонт.

## ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ І ПАРАДАК

Васіль Пяцюк, дырэктар Дзятлаўскага раённага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі, расказаў аб работах па паляпшэнні інфраструктуры населеных пунктаў, праведзеных на працягу першых пяці месяцаў 2025 года. Адным з асноўных кірункаў стала добраўпарадкаванне прыдамавых тэрыторый і дарог. У бягучым годзе плануецца заасфальтаваць 22,4 тысячы квадратных метраў дарожнай сеткі, з якіх каля 13 тысяч ужо пакрыты асфальтам. Акрамя таго, адрамантавана каля 450 квадратных метраў тратуараў, каб зрабіць прагулкі больш камфортнымі і бяспечнымі. У планах — адрамантаваць яшчэ тысячу квадратных метраў. У зялёных зонах высаджана 100 новых дрэў і кустоў, каб зрабіць двары і скверы больш прывабнымі. Адрамантавана пяць дзіцячых гульнявых пляцовак. Таксама палепшаны кантэйнерныя пляцоўкі для смецця: закуплена 35 новых кантэйнераў, а некалькі старых адрамантавана.

**У цэнтры раёна стала святлей дзякуючы ўстаноўцы 56 новых святлодыёдных ліхтароў, якія зрабілі вячэрнія прагулкі больш камфортнымі. На пляжы з'явілася шэсць новых шэзлонгаў і катамаранаў. 13 чэрвеня ў гарадскім парку адкрыты фантан «Неапаль».**

Добраўпарадкаванне працягваецца: вядуцца работы прыкладна на 15 аб'ектах па ўсім раёне. Кіраўнік раённай адміністрацыі зазначыў, што гэта не разавае мерапрыемства і ўжо абмяркоўваюцца планы на наступны год. Дэпутаты агледзелі завершаныя і наяўныя аб'екты, пацвердзіўшы, што задачы па добраўпарадкаванні ў Дзятлаўскім раёне выконваюцца ў адпаведнасці з планам і прыносяць жыхарам карысць.

Прыгажосць і дагледжанасць сталі часткай паўсядзённага жыцця, як і развітая інфраструктура, не толькі ў Дзятлаўскім раёне. Адпраўляючыся ў камандзіроўкі ў розныя гарады Гродзенскай вобласці, бачу прыгажосць вакол і мімаволі ўспамінаю свае школьныя гады. Яшчэ 15 гадоў таму так не было: чыста, але без глянцу. Узяць хаця б Малую Бераставіцу, дзе я нарадзілася і вырасла. Колькі разоў мы з сяброўкай казалі падчас прагулак, што было б выдатна на месцы пусткі разбіць парк. І вось, вярнуўшыся па рабоце на малую радзіму, убачыла парк, акультураныя берагі рачулкі. І не толькі гэта! Вынік планамернай працы на месцах выразна відаць як у вялікіх гарадах, так і ў малых населеных пунктах.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**


Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.**

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

